антыўрадавыя акцыі. У другой палове 1906 г. колькасць палітычных выступленняў рабочых рэзка ўпала, таму што ўрад перайшоў да адкрытага ваеннага тэрору. Прыкладна ў два разы ў параўнанні з 1905 г. знізілася і колькасць удзельнікаў эканамічных стачак на Беларусі. Але сялянскі рух летам 1906 г. сваім размахам набліжаўся да асенняга ўздыму 1905 г. Толькі ў чэрвені—ліпені ў беларускіх губернях адбылося больш за 200 выступленняў. «Рэвалюцыйны рух са стыхійнай хуткасцю і сілай ахоплівае сялянскія масы... Патрэбна прыняць надзвычайныя меры і прысласць конныя войскі»[8], — тэлеграфаваў Клімавіцкі прадвадзіцель дваранства міністру ўнутраных спраў. Масавы характар набылі захопы памешчыцкіх зямель, сельскагаспадарчыя забастоўкі. Вялікае выступленне адбылося ў маёнтку Даманаўшчына Гродзенскага павета. У адказ на спробу сялян вёскі Яскевічы захапіць зямлю графіні Красінскай выкліканая паліцыя арыштавала шэсць галоўных «падбухторшчыкаў», што абурыла ўсю вёску: у паліцэйскіх паляцелі палкі і камяні. Праз некалькі дзён сяляне зноў выйшлі ў поле, каб не даць батракам заараць панскую зямлю. Калі натоўп сялян ізноў сустрэў паліцэйскіх каменнем, тыя адкрылі агонь і два чалавекі былі цяжка паранены[9]. У вёсках Кунзевічы, Мінюцычы, Ганцавічы, Любонічы і Таршычы Навагрудскага павета жыхары не дазвалялі давераным памешчыка наймаць нетутэйшых людзей на работу. Мясцовая паліцыя не змагла справіцца з хваляваннем сялян. На дапамогу ёй губернатар спешна накіраваў у павет паўсотні казакоў Таманскага палка[10].

Увосень 1906 г. з-за нізкай аплаты працы пачаліся забастоўкі батракоў і падзёншчыкаў. Найбольш актыўна яны праходзілі ў Віленскім і Ашмянскім паветах Віленскай губерні, Слуцкім, Ігуменскім Мінскай губерні і ў Пружанскім павеце Гродзенскай губерні. Забастоўшчыкі патрабавалі павялічыць падзённую плату і не дапускалі да работы сялян, нанятых у іншых паветах.

У сакавіку—маі 1907 г. сялянскія выступленні адбываліся толькі ў асобных вёсках, а з ліпеня спыніліся канчаткова.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг., нягледзячы на паражэнне, абудзіла палітычную свядомасць народа і аказала вялікі ўплыў на асаблівасці далейшага развіцця палітычнага руху ў краіне.

1 Гл.: Істория рабочего класса Белорусской ССР. Мн., 1984. Т. 1. С. 217.

2 Ш а б у н я К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962. С. 188.

3 Гл.: Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. 3. С. 498.

4 Гл.: М а й з е л ь Л. Н. 1905—1907 гг. на Беларусі. Мн., 1934. С. 94.

5 История Беларуси. Вопросы и ответы. Мн., 1993. С. 59.

6 Гл.: Беларуская савецкая энцыклапедыя. Мн., 1970. Т. 2. С. 135.

7 Гл.: Л и п и н с к и й Л., Л у к ь я н о в Е. Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900—1907 гг.). Мн., 1968. С. 140, 141.

8 Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Мн., 1955. С. 488.

9 Документы и материалы по истории Белоруссии... Т. 3. С. 568.

10 Гл.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. С. 576.

А. М. ВАСІЛЬЕВА

## ДА ПЫТАННЯ АБ УЗНІКНЕННІ БЕЛАРУСКАГА КАТАЛІЦКАГА РУХУ

Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, адна з найбольш уплывовых каталіцкіх палітычных сіл, дзейнічала пераважна на тэрыторыі Заходняй Беларусі з 1917 па 1939 г. Вядома, што большасць беларускага насельніцтва, у тым ліку і Заходняй Беларусі, складалі праваслаўныя. Таму ўзнікае пытанне: чаму менавіта каталіцкі рух аказаўся найбольш жыццяздольным і, нягледзячы на моцны ўціск і прамыя рэпрэсіі польскіх уладаў, пратрываў да 1939 г.?

Цікава, што беларускі нацыянальна-палітычны рух зарадзіўся менавіта ў асяроддзі адукаванага каталіцкага насельніцтва. Дастаткова ўспомніць, бадай што, першых беларускамоўных пісьменнікаў В. Дуніна-Марцінкевіча і У. Сыракомлю, або такія з'явы, як творчасць Э. Ажэшкі, у раманах якой беларусы размаўляюць па-беларуску, ці оперу С. Манюшкі «Ідылія» («Сялянка»), дзе толькі памешчыкі спявалі па-польску, а народ — па-беларуску. У каталіцкіх сем'ях выхоўваліся класікі беларускай літаратуры Я. Купала і М. Багдановіч.

Любы сацыяльна-палітычны феномен трэба разглядаць у шырокім гістарычным кантэксце. Прадумовы ўзнікнення беларускага каталіцкага руху сфарміраваліся ў другой палове XIX — пач. XX ст., калі ў эканамічным, сацыяльна-палітычным і канфесійным жыцці Беларусі адбыліся істотныя змены. Іх аналіз дазваляе даць адказ на пастаўленае пытанне.

Большасць беларускага каталіцкага насельніцтва была сканцэнтравана на паўночным захадзе Беларусі. Адпаведна з тагачасным адміністратыўным падзелам гэта тэрыторыя Гродзенскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў Гродзенскай, Мінскага, Наваградскага і Слуцкага паветаў Мінскай і Ашмянскага, Вілейскага, Лідскага паветаў Віленскай губерняў. На гэтай тэрыторыі жыло 37 % насельніцтва Беларусі і 76 % беларусаў-каталікоў. У сярэднім каталікі складалі тут 35 % жыхароў. Найбольшай іх удзельная вага была у Ашмянскім (72 %), Лідскім (55 %) і Ваўкавыскім (52 %) паветах[1].

У XIX — пач. XX ст. паўночны захад вылучаўся як найбольш развіты ў эканамічных адносінах рэгіён Беларусі. Аб'ём вытворчасці прамысловасці Заходняй Беларусі ў канцы XIX ст. быў на 34,6 % вышэй, чым ва Усходняй[2]. Капіталістычныя адносіны тут хутчэй замацаваліся і ў сельскай гаспадарцы. Гэтаму спрыяла адсутнасць абшчыннага землекарыстання. Так, напрыклад, у Магілёўскай губерні абшчыны валодалі 83,7 % сялянскай зямлі, Віцебскай — 37,7, а ў Мінскай — 3, Гродзенскай — 2,2 %. У Віленскай губерні абшчынага землекарыстання ўвогуле не існавала[3]. Менавіта таму на захадзе хутчэй фарміраваўся пласт заможнага сялянства, якое і склала сацыяльную базу нацыянальнага руху. Так, напрыклад, у 1905 г. у Мінскай губерні 45 % усіх сялянскіх гаспадарак валодалі больш чым дваццаццю дзесяцінамі зямлі, у Гродзенскай — 27,3, а ў Магілёўскай — толькі 0,4 %[4]. Невыпадкова таму і ўзровень пісьменнасці ў Заходняй Беларусі быў вышэйшым. Тут было сканцэнтравана больш паловы ўсіх пісьменных беларусаў[5]. Менавіта мінска-маладзечанскія гаворкі склалі аснову беларускай літаратурнай мовы. Гэты рэгіён стаў асноўным арэалам кансалідацыі беларускай нацыі ў канцы XIX — пач. XX ст.

На фарміраванне беларускага каталіцкага руху вельмі моцна ўплывалі і іншыя фактары — перш за ўсё палітыка расійскай адміністрацыі. Пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. было зроблена шэраг захадаў, накіраваных на ўзмацненне русіфікацыі Беларусі: забаранялася друкаваць беларускія кнігі на лацінцы, што фактычна ў той час значыла забарону беларускага друку; назвы Беларусь і беларусы зніклі з афіцыйнага справаводства і, нават, перыёдыкі; пачалося шырокае ўкараненне пачатковай адукацыі на рускай мове. Аднак у найбольшай ступені дзейнасць расійскай адміністрацыі была скіравана супраць так званага «польскага элемента» ў краі. Былі забаронены польскі друк і адукацыя, абмежавана сфера карыстання польскай мовай. Яна дазвалялася толькі ў хатніх зносінах і касцёле. Палякам забаранялася працаваць у дзяржаўных установах і, што самае галоўнае, набываць зямельную маёмасць. Ажыццяўляліся рэпрэсіўныя меры супраць каталіцкай царквы. Так, да 1868 г. на Беларусі было зачынена 128 касцёлаў, 34 каталіцкія кляштары і 67 каплічак. Толькі на працягу 1864 г. звыш 70 тысяч каталікоў было прымусова пераведзена ў праваслаўе[6].

З той нагоды, што чыноўнікі цалкам атаясамлівалі каталікоў і палякаў, усе гэтыя мерапрыемствы цяжка адбіліся і на становішчы каталікоў-беларусаў. Аднак с цягам часу палітыка расійскай адміністра-

цыі станавілася больш гнуткай. Пачынаючы з 1869 г. спецыяльныя цыркуляры МУС даводзілі, што палякамі трэба лічыць не ўсіх каталікоў, а толькі тых, якія «засвоілі польскую нацыянальнасць»[7]. Было вызначана найменшае зло: лепш хай лічаць сябе беларусамі, чым палякамі. Тым больш, што арыентаваныя на Польшчу памешчыцка-клерыкальныя колы намагаліся ўзмацніць сваё сацыяльнае становішча менавіта за кошт беларусаў-каталікоў. Таму, адпаведна з так званай палітыкай «раз'яднання паланізма ад каталіцызму» каталікам-беларусам тлумачылі, што яны не палякі, а беларусы. Гэтая сітуацыя стварала пэўную свабоду манеўра для каталікоў. Вядомыя выпадкі, калі яны нават бралі спецыяльныя пасведчанні аб сваім беларускім паходжанні для набыцця зямлі. У тых умовах гэта паспрыяла адраджэнню беларускай самасвядомасці у значнай часткі паланізаваных каталікоў. Таму не выпадкова, што «беларусы-каталікі ўсвядомілі сябе як нацыю ў значна большай ступені чым беларусы-праваслаўныя», сведчыць даследчык пач. XX ст. Е. Канчэр[8]. Канфесійная прыналежнасць у дадзеным выпадку стала формай паскарэння фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

Значную ролю ў гэтым працэсе адыграла і моўнае пытанне. Каталіцкая царква ставілася да беларускай мовы больш памяркоўна, чым праваслаўная. Яшчэ ў 1776 г. каталіцкі епіскап Станіслаў Сестранцэвіч хадайнічаў аб увядзенні беларускай мовы ў касцёле. Падобныя захады ў 1896 г. прымаў і Магілёўскі епіскап Сымон[9]. Ёсць падставы меркаваць, што ён звяртаўся не толькі да расійскай адміністрацыі, але і да вышэйшай духоўнай улады. Сведчаннем таго з'яўляецца спецыяльная була папы Ільва XIII ад 08.05.1897 г. № 37522, прызначаная менавіта для Магілёўскай губерні, у якой было загадана «ужываць беларускую мову ў касцёле там, дзе народ гутарыць па беларуску»[10]. Трэба адзначыць, што гэтыя памкненні ў пэўных адносінах адпавядалі расійскай палітыцы «раз'яднання паланізма ад каталіцызму». І ў 70-я гг. XIX ст., і пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. спецыяльныя цыркуляры рэкамендавалі ўжываць беларускую мову ў касцёлах. Ёсць звесткі, што некаторыя ксяндзы карысталіся гэтымі абставінамі. Так, вядома, што ў мястэчку Ула Лепельскага павета з 1876 па 1882 г. ксёндз Мотус праводзіў літургіі на беларускай мове. Значную ролю ў пашырэнні беларускай мовы ў касцёле адыграў кіраўнік Віленскай дыяцэзіі ў 1903—1917 гг. архіепіскап Э. Роп. Летам 1917 г. ён афіцыйна дазволіў даводзіць казанні да беларусаў на беларускай мове[11]. Але, бадай што, найбольшае значэнне ў пашырэнні беларускай мовы ў касцёле мела дзейнасць актывістаў беларускага каталіцкага руху, асабліва выданне каталіцкага часопіса «Беларус» (1913—1915), у якім друкаваліся каталіцкія паэты К. Стэповіч (У. Сваяк) і А. Астрамовіч (А. Зязюля).

Істотны ўплыў на развіццё беларускага каталіцкага руху зрабілі спецыфічныя асаблівасці арганізацыйнай структуры каталіцкай царквы і палітыка Ватыкана ў канцы XIX — пач. XX ст. У адрозненне ад праваслаўя каталіцкая царква на Беларусі знаходзілася ў кананічнай залежнасці ад апостальскай сталіцы, якая этнічна не была звязана з якой-небудзь дзяржавай. Ватыкан жа, які імкнуўся пашырыць каталіцтва сярод праваслаўнага насельніцтва, лічыў больш прыдатным для гэтай справы не палякаў, а беларусаў. На думку кіраўнікоў каталіцкай царквы, польскі каталіцкі клір на Беларусі больш увагі надаваў пашырэнню паланізацыі, а не інтарэсам царквы. Таму Ватыкан абапіраўся і, у пэўнай ступені, падтрымліваў кадры маладога інтэлегентнага і нацыянальнасвядомага беларускага каталіцкага святарства. Менавіта гэта і дазволіла адносна нешматлікай групе ксяндзоў-беларусаў супрацьстаяць уціску з боку магутнага польскага каталіцкага кліру ў 20—30-я гг.

Не меншы ўплыў на развіццё беларускага каталіцкага руху зрабілі істотныя змены ў стаўленні Ватыкана на ўдзел у палітычным жыцці ўвогуле. Выключнае значэнне ў гэтых адносінах мелі энцыклікі папы Ільва XIII «Rerurum novarum» (1881 г.) і «Graves de communi» (1901 г.), якія і сёння лічацца асновай палітычнай праграмы Ватыкана. У іх адлюстроўваліся погляды касцёла на дзяржаву. Яна, на думку Ільва XIII,

уяўлялася хрысціянскай дэмакратыяй, заснаванай на падзеле трох ўладаў — заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Гэтае палажэнне было ў тыя часы прынцыпова новым для каталіцкага светапогляду[12]. Каб паказаць касцёл абаронцай сацыяльных рэформаў, Леў XIII звяртаў увагу на бядотнае становішча рабочага люду, асуджаў празмерную эксплуатацыю. Сацыялістычныя тэндэнцыі, аднак, не кранал́і аснову капіталістычнага ладу — прыватную уласнасць, якая лічылася свяшчэннай і богаданай. Адмена прыватнай уласнасці, як здавалася аўтару, прыраўноўвае чалавека да жывёлы[13]. Але самае галоўнае — энцыклікі адчынялі шырокі шлях да палітычнай дзейнасці каталіцкага кліру.

Ужо ў пачатку XX ст. уплывовыя каталіцкія партыі былі створаны ў Германіі, Аўстра-Венгрыі, Бельгіі і Польшчы. Іх прыклад ўскосна і прама ўздзейнічаў на развіццё беларскага каталіцкага руху. Вядома, напрыклад, што яшчэ ў 1907—1909 гг. у Інсбруку і Мюнхене ўтварыліся гурткі беларускіх студэнтаў, якія вучыліся ў каталіцкіх універсітэтах. Сярод актывістаў іх былі Ф. Грынкевіч, А. Лісоўскі і студэнтка Сялянка з Гродна[14]. Менавіта гэтыя гурткі сталі першай формай арганізацыйнага афармлення беларускага каталіцкага руху. Ускосны уплыў адчуваецца ў больш позніх праграмных дакументах беларускага каталіцкага руху. У тым ліку — першай праграме БХД (1918 г.), шмат палажэнняў якой (аб прыватнай уласнасці, адносінах да працы, выхавання, сям'і) паўтараюць, ці нагадваюць ідэі папскіх энцыклік і праграм заходнееўрапейскіх хрысціянска-дэмакратычных партый[15].

Такім чынам, узнікненне беларускага каталіцкага руху — вынік складанага ўзаемадзеяння разнастайных фактараў. Знаходжанне ў эканамічна найбольш развітым рэгіёне Беларусі стварыла неабходныя сацыяльна-культурныя прадумовы актыўнага ўдзелу каталікоў у нацыянальным руху. Палітыка «раз'яднання паланізма і каталіцызму», якую праводзіла расійская адміністрацыя, парадаксальным чынам паўплывала на фарміраванне беларускай самасвядомасці каталіцкага насельніцтва. Істотныя змены, якія адбыліся ў палітычнай дактрыны Ватыкана ў канцы XIX ст., падштурхнулі стварэнне арганізацыйных структур беларускага каталіцкага руху.

1 Гл.: Чаквін І. У., Церашковіч Г. Т., Касперовіч Г. І. // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 70.
2 Гл.: Экономка Белоруссии в эпоху империализма. Мн., 1965. С. 75.
3 Гл.: Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии, 2-я половина XIX в. Мн., 1971. С. 169.
4 Там жа. С. 164.
5 Гл.: Чаквін І. У., Церашковіч П. У., Касперовіч Г. І. // Этнаграфія Беларусі. С. 70.
6 Гл.: Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. Мн., 1980. С. 41; Церковные ведомости. 1910. № 2. С. 77.
7 ДГАРБ. Ф. 1430, воп. 1, спр. 33680, арк. 1.
8 Гл.: Канчер Е. С. Белорусский вопрос. Пг., 1919. С. 107.
9 НАРБ. Ф. 62. воп. 3, спр. 10, арк. 38.
10 Пануцэвіч В. // Спадчына. 1993. № 3. С. 72.
11 ДГАРБ. Ф. 1430, воп. 1, спр. 33861, арк. 33; Станкевіч А. Родная мова ў святынях. Вільня, 1929. С. 95.
12 Гл.: Спадчына. 1992. № 6. С. 23.
13 Гл.: Григулевич И. Р. Папство. Век XX. М., 1978. С. 95.
14 Stankevic A. Belaruski chrisrianski ruh. Vilnia, 1929. S. 46.
15 Гл.: Ustava i prahrama Chryscijanskaj Demakratychnaj Zlucznasci Bielarusau. Miensk, 1920.